# Педагагічныя школы нашай ордэнаноснай рэспублікі будуць лепшымі ў СССР!

## *НІКАЛАЮ ФЁДАРАВІЧУ ГІКАЛО*
## *МІКАЛАЮ МАТВЕЕВІЧУ ГАЛАДЗЕДУ*

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ДЫРЭКТАРОЎ І САКРАТАРОЎ КАМІТЭТАЎ ЛКСМБ ВЫШЭЙШЫХ І СЯРЭДНІХ ПЕДАГАГІЧНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БССР ВІНШУЕ ВАС З УЗНАГАРОДАЙ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА—ЛЕПШЫМ ДОКАЗАМ ВАШАГА ЎМЕЛАГА БОЛЬШЭВІЦКАГА НЯСТОМНАГА КІРАЎНІЦТВА. СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУССЮ ЯКАЯ СТАЛА Ў РАДЫ ОРДЭНАНОСНЫХ РЭСПУБЛІК І АБЛАСЦЕЙ

ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА АБАВЯЗВАЕ І НАС ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ БЫЦЬ У ПЕРАДАВЫХ РАДАХ БАЙЦОЎ ЗА ДАЛЕЙШЫЯ ПЕРАМОГІ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСТ І РОСКВІТ НАШАЙ ОРДЭНАНОСНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СВАЕ СІЛЫ, УСЮ УВАГУ НА ХУТЧЭЙШУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ЎКАЗАННЯЎ ПАРТЫІ АБ ЛІКВІДАЦЫІ АДСТАВАННЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ. ПАД ЛОЗУНГАМ: **«ПЕДАГАГІЧНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ОРДЭНАНОСНАЙ РЭСПУБЛІКІ ПАВІННЫ СТАЦЬ ЛЕПШЫМІ Ў СОВЕЦКІМ САЮЗЕ».**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАПІТАН КРАІНЫ СОВЕТАЎ, ДАРАГІ, ЛЮБІМЫ СТАЛІН!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ОРДЭНАНОСНАЯ СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ — НАДЗЕЙНЫ ФАРПОСТ СОВЕЦКАГА САЮЗА!**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ